УДК 94 : 356/358 (438) «17»

С.А. Чаропка

Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны

# АРМІЯ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ ПАСЛЯ РЭФОРМЫ 1775 г.

У прадстаўленым артыкуле разглядаецца становішча ўзброеных сіл Рэчы Паспалітай у другой палове XVIII ст. Вывучаюцца асноўныя накірункі рэалізацыі ваеннай рэформы ў Рэчы Паспалітай 1775 г., якая стала сур'ѐзнай спробай у справе мадэрнізацыі як польскай каронннай арміі, так і войска Вялікага княства Літоўскага. У XVIII ст. Рэч Паспалітая пераўтварылася ў сапраўдны —прахадны двор  для армій суседніх дзяржаў і сярод іншых важнейшых прычын склаўшагася становішча стала слабасць узброеных сіл Рэчы Паспалітай, застой у свядомасці грамадства ў пытаннях грамадскапалітычнага і эканамічнага жыцця, у тым ліку і ў пытанні арганізацыі абароны дзяржавы. Тым не менш, здаровыя сілы грамадства польска-літоўскай дзяржавы ўсѐ больш пераконваліся, што спадзяванні на архаічнае паспалітае рушанне і наѐмную пяхоту марныя, што трэба прыступаць да арганізацыі рэгулярнага войска, дзеля чаго трэба правядзенне кардынальных рэформ у справе арганізацыі арміі. Нягледзячы на тое, што вайсковая гісторыя Рэчы Паспалітай XVIII ст. ужо знайшла адлюстраванне ў гістарыяграфіі, тым не менш, асобныя аспекты гэтай праблемы, такія як працэс стварэння рэгулярнай арміі ВКЛ, яшчэ застаецца tabula rasa ў айчыннай навуковай літаратуры. Зроблены толькі першыя спробы разгляду гэтага пытання [1, 2, 3]. Сур‘ѐзны задзел у распрацоўцы гэтага пытання зрабілі польскія гісторыкі, якія даследуючы мінуўшчыну кароннага войска закраналі асобныя пытанні існавання літоўскай арміі [4 - 14]. Улічваючы навуковую значнасць праблемы і практычную адсутнасць спецыяльных даследаванняў па тэматыцы даследваванне гэтай тэмы з‘яўляецца дастаткова актуальнай справай. Першым важным крокам у справе арганізацыі рэгулярнай арміі ў Рэчы Паспалітай стала ваенная рэформа 1717 г., якая прадугледжвала сур‘ѐзныя змены ў структуры ўзброеных сіл Рэчы Паспалітай. —Нямы сойм 1717 г. вызначыў сталы штат войска, лічбы бюджэту і крыніцы фінансавання арміі [15, с.137]. Аднак 24-тысячная армія Рэчы Паспалітай аказалася нават меншым, чым Саксоніі, якая налічвала 30 тыс. жаўнераў [16, с.8, 10]. На канвакацыйным сойму 7 мая 1764 г. было прынята рашэнне аб стварэнні —Consilium bellicum альбо Камісіі вайсковай , якая мусіла стаць каталізатарам рэформ у арміі [17, с.39, 83]. На каранацыйным сойму 3 снежня 1764 г. было абвешчана аб стварэнні Вайсковай камісіі ВКЛ, [18, с.170]. Мэтай працы камісіі стала ўсебаковае вывучэнне становішча арміі Рэчы Паспалітай і выкараненне асноўных праблем у ваеннай сістэме краіны [19, с.20]. На думку Б.Твардоўскага Камісія здолела зрабіць шмат для дасягнення сваѐй мэты —… усталявала парадак у арганізацыі, павысіла аслабленую субардынацыю і дысцыпліну, павысіла ўзровень адукацыі ў вышэйшых вайсковых, і ў рэшце рэшт стварыла армію, якая не саступала аніводнай тагачаснай еўрапейскай …  [19, с. 20]. На сойме 1766 г. былі зроблены захады накіраваныя на павышэнне фінансавага забеспячэння арміі Рэчы Паспалітай. Так на яе ўтрыманне было дадаткова выдаткавана 749 250 злотых штогод, да нормы, якая была прынята яшчэ на —нямым  сойму 1717 г. [20, с. 234- 235]. Але рэфармаванне арміі было прыпынена палітычным крызісам, у якім апынулася ўся Рэч Паспалітая з 1768-1772 гг. Сумнае становішча арміі Рэчы Паспалітай, яе відавочная няздольнасць абараніць краіну, выклікала злабадзѐннае пытанне аб неабходнасці кардынальнага рэфармавання вайсковай структуры. Гэтае пытанне стала адным з найбольш 18 важных на сойме 1773-1775 г. На сойме было прынята рашэнне аб павышэнні колькасці арміі Рэчы Паспалітай з 24 да 30 тыс. чалавек ( 22 тыс. – каронная, 8 тыс. – літоўская). Была зменена сістэма вышэйшага кіравання войскам. Найвышэйшая ўлада была перададзена ад гетманаў да Вайсковага дэпартамента, дзе рашэнні прымаліся калегіяльна, а гетманы былі толькі сябрамі гэтага органа [9, с.352]. Гетманы пазбавіліся права прызначэння афіцэраў, якое перайшло да караля [21, с.534]. Прызначэнне падафіцэраў засталося ў кампетэнцыі палкоўнікаў. Нягледзячы на звыклы для дзяржаўнага бюджэту Рэчы Паспалітай недахоп сродкаў, на фінансаванне адной толькі арміі ВКЛ было

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

выдаткавана 6 596 000 зл. [22, с. 402-403]. Аднак, як гэта часта здаралася ў гісторыі Рэчы Паспалітай грошаў на ўсе задумы не хапіла, таму сейм 1776 г. выдаткаваў грошаў на ўтрыманне толькі 12311 жаўнера ў Кароне і 4770 на Літве. Тым не менш, генеральная лінія на павелічэнне колькасці войска захавалася і да 1786 г. армія Рэчы Паспалітай колькасна вырасла да 18 500 жаўнераў (з іх 14 тыс. у Польшчы і 4,5 тыс. у ВКЛ). Нягледзячы на тое, што ў падраздзяленнях колькасць афіцэраў часта дасягала трацiны асабістага складу, тым не менш, ва ўмовах існавання сістэмы продажу-пакупкі афіцэрскіх званняў, кваліфікаваных афіцэраў відавочна не хапала. У сувязі з гэтым паслы выдзелілі 200 тыс. злотых на заснаванне кадэцкага корпуса, які б размясціўся ў Гародні. Аднак неабходныя матэрыяльныя сродкі ў скарбе краіны адсутнічалі, таму ў 1776 г. вайсковы бюджэт быў скарочаны больш чым напалову да 2 300 000 зл [23, с.565, 568]. Увага надавалася падрыхтоўцы дасведчаных афіцэрскіх кадраў. Паводле пастановы сойма 1778 г. трацiна кадэтаў школы павінна была паходзіць з ВКЛ [24, с. 585-586]. Асобна 100 тыс. зл. выдзелялася на дзейнасць рыцарскай школы ў Варшаве [23, с.568]. Рэформа арміі прадугледжвала павелічэнне колькасці пяхотных падраздзяленняў за кошт скарачэння некаторых кавалерыйскіх часцей, а таксама ўпарадкаванне арганізацыі конніцы. У прыватнасці, замест ранейшага падзелу кавалерыі на гусараў, панцырных, пяцігорцаў і казацка-татарскіх лёгкіх харугваў уводзіўся падзел на больш цяжкую нацыянальную кавалерыю і больш лёгкую пярэднюю варту. Па выніках рэформы ў 1776-1777 гг. каронная армія падлзялялася на 3 дывізіі (вялікапольская, малапольская і ўкраінска-падольская), армія ВКЛ на 2 дывізіі. Кожная з дывізій уключала ўсе роды войск – пяхоту, пярэднюю варту і нацыянальную кавалерыю. Каронная армія складалася з наступных адзінак. Вышэйшым органам аператыўнага камандавання з‘яўляўся Генеральны штаб, якому падпарадкоўваліся 4 брыгады нацыянальнай кавалерыі (вялікапольская і 3 украінскіх), 2 палкі пярэдняй варты, 4 драгунскіх палка, 14 пяхотных палкоў, 2 венгерскіх пяхотных харугвы і корпус артылерыі. Павелічэнне пяхотных падраздзяленняў адбылося за кошт расфарміравання трох драгунскіх палкоў. У цэлым пяхотныя палкі, за выключэннем даволі баяздольнага гвардзейскага палка колькасцю больш за 1,5 тыс. штыкоў, былі дастаткова слабымі, налічвалі ад 353 да 467 жаўнераў, што не адпавядала нават батальёну ў замежных арміях таго часу. Рота вогуле налічвала ад 45 да 57 жаўнераў. Не лепшая сітуацыя была і ў захаваўшыхся драгунскіх палках. Колькасць драгунаў у палку складала каля 250 шабель, толькі гвардзейскі полк налічваў 465 жаўнераў. Каронныя брыгады нацыянальнай кавалерыі складаліся з 24 харугваў, якія сукупна налічвалі па 737 шабель. Палкі пярэдняй варты складаліся з 8 харугваў па 47 жаўнераў у кожнай. Корпус артылерыі кароннай быў павялічаны да 404 жаўнераў. Структурна корпус падзяляўся на 2 брыгады па 2 роты ў кожнай. Кожная рота налічвала па 83 артылерыстаў. Пры артылерыйскім корпусе быў створаны корпус інжынераў з 12 чалавек. Да артылерыі быў далучаны таксама пяхотны батальён колькасцю 427 жаўнераў. 9 снежня 1776 г. быў складзены кампут войска ВКЛ, які дае выдатную інфармацыю аб структуры арміі і яе фінансаванні [25]. Вялікія змены адбываліся ў дачыненні драгунаў і пяхоты. Лейб-рэгімент драгунаў каралеўскіх ВКЛ пераўтвараўся ў полк карабінераў гвардыі коннай. Астатнія тры драгунскія палкі спешываліся і пераўтвараліся ў пяхотныя 19 палкі [22, с. 403]. Так, драгунскі рэгімент конны Булавы Вялікай стаў асновай другога рэгімента пешага; драгунскі рэгімент конны Булавы Польнай пераўтварыўся ў чацвёрты рэгімент пешы; рэгімент драгунаў каралевіча быў пераўтвораны ў пяты рэгімент пешы ВКЛ. Такім чынам, колькасць пяхотных падраздзяленняў значна павялічалася, што адпавядала неабходным для таго часу тэндэнцыям у ваеннай справе. Пяхота ВКЛ складалася з сямі палкоў і ўключала ў сябе рэгімент пешы гвардыі літоўскай і 6 палкоў пешых, а таксама 2 янычарскіх харугвы [22, с. 403]. Асобнае, але вельмі нязначнае месца ў літоўскай арміі займаў корпус артылерыі, які фактычна складаўся з 2 рот. Таксама баявым падраздзяленнем была харугва венгерскай пяхоты Галоўнага Трыбунала ВКЛ, якая, аднак, у штат арміі афіцыйна не ўваходзіла. Кавалерыя Вялікага княства налічвала 2670 чалавек і складалася з драгунскага палка гвардыі коннай, 2 брыгад нацыянальнай кавалерыі і 5 палкоў пярэдняй варты. Полк коннай гвардыі ВКЛ у адрозненне ад адпаведнага каронага палка налічваў не 425, а ўсяго 318 чалавек, на фінансаванне якіх выдзелялася 269 364

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

злотых, што эканоміла для дзяржаўнага бюджэта крыху больш за 90 тыс. злотых [25, арк. 21]. Абедзьве брыгады нацыянальнай кавалерыі налічвалі па 478 коней. Брыгада складалася з 4 швадронаў, кожны з якіх ўключаў у сябе па 4 харугвы. На чале брыгады знаходзіўся камендант, які хаця меў на эпалеце чатыры касых стужкі, але ў пехоце адпавядаў не шэфу палка, а генерал-маѐру [25, арк 13]. Тактычнай адзінкай брыгады зяўлялася харугва. У кожным з 4 швадронаў налічвалася па 4 паручнікі, кожны з якіх кіраваў асобнай харугвай [25, арк 16]. Рэальным кіраўнікам харугвы быў намеснік, а не стаячы над ім харунжы. Паручнік і ратмістр адыгрывалі хутчэй рытуальныя функцыі. Найбольш цяжка рэформа праходзіла менавіта ў брыгадах нацыянальнай кавалерыі. Ратмістры, паручнікі і харунжыя нацыянальнай кавалерыі звычайна паходзілі з магнатаў, былі ваяводамі, кашталянамі і г.д. Па ўспамінах Е. Кітовіча ратмістрамі нацыянальнай кавалерыі былі нават каролі і віленскі біспуп [26, с.157]. Як адзначае сучаснік С. Касмоўскі яны не мелі ―ніякага ўяўлення аб вайсковай службе … Гэтыя ўсе толькі для гонару нашэння мундзіра тыя рангі мелі, бо ранг ратмістра азначаў генерала, ранг паручніка – палкоўніка, а харунжага ранг падпалкоўніка, намеснік жа меў ранг капітана, таварыш ранг харунжага [27, с 6]. Важным элементам рэформы стала ўвядзенне сістэмы адпаведнасці вайсковых званняў кавалерыі і пяхоты, у прыватнасці: ―таварыш роўны будзе мець ранг з харужым у войску, намеснік з паручнікам, харунжы з капітанам, паручнік з палкоўнікам. Камендант брыгады нацыянальнай мець будзе ранг генерал-маѐра, віцэ-камендант той жа брыгады нацыянальнай, ранг палкоўніка [28, с. 100]. Былі дакладна вызначаны паўнамоцтвы генерала артылерыі, генерал-лейтэнантаў і генерал-маѐраў, а таксама пытанні адказнасці вайскоўцаў за зробленыі імі злачынствы ў адносінах да мірнага насельніцтва [28, с. 100-104]. У адрозненне ад нацыянальнай кавалерыі ў палках пярэдняй варты ВКЛ колькасць асабістага складу падраздзяленняў была рознай. Напрыклад у 1 палку каралевіча пад камандаваннем Бараноўскага налічвалася 374 чалавекі, 2 полк Булавы Вялікай і 3 полк Булавы Польнай пад камандаваннем Галынскага і Раманоўскага налічвалі па 150 ваяроў адпаведна, у 4 палку Панятоўскага службу выконвалі 327 жаўнераў, а самым шматлікім быў 5 полк генерала Беляка, які меў 395 шабель у сваім складзе [25, арк. 6]. Звычайна полк складаўся з 6 харугваў і штаба. У штаб палка ўваходзілі палкоўнік, маѐр і 6 ратмістраў, якія, як і ў нацыянальнай кавалерый, толькі фармальна камандавалі харугвамі, пераклаўшы гэты цяжар на паручнікаў. На чале кожнай з харугваў стаялі паручнікі (у палку Беляка былі таксама секонд-паручнікі), харунжыя, таварышы, капралы трубачы і пачтовыя [25, арк. 37, 41]. Вялікай праблемай для войска была заганная практыка продажу афіцэрскіх пасад. Званне ратмістра каштавала 2 тыс. зл., паручніка – 1 тыс., харунжага - 500, намесніка – 250, таварыша - 100 зл. [27, с.7]. Калі ўлічыць, што заробак паручніка ў нацыянальнай кавалерыі складаў 3400 зл., у пярэдняй варце - 1500, а ў пяхоце – 1200 зл. у год, то камерцыйная карысць ад набыцця звання відавочная. Сучаснік Ю. Рулікоўскі адзначае, што ―можна было 20 быць афіцэрам і не бачыць свайго рэгіменту або харугвы, а седзячы спакойна ў доме гаспадарыць [29, с.192]. На сойме 1784 г. былі зроблены захады па абмежаванню продажу афіцэрамі сваіх званняў. [30, с. 12]. Найбольш буйным пяхотным падраздзяленнем быў рэгімент гвардыі пешай ВКЛ, які колькасна перавышаў палявыя пяхотныя палкі і налічваў 609 штыкоў. Палявыя палкі 1-шы і 3-ці Булавы Вялікай, а таксама 2-гі і 4-ты Булавы Польнай налічвалі па 220 чалавек і мелі аднолькавую структуру. У адрозненне ад гвардзейскага рэгімента, палявыя палкі складаліся толькі з аднаго батальѐна, які, у сваю чаргу, ўключаў чатыры кампаніі (роты) па 52 чалавека ў кожнай. Пяты і шосты палкі былі меншымі за папярэднія палявыя палкі і налічвалі 171 і 110 жаўнераў адпаведна. Функцыі гвардыі пры кожным з гетманаў выконвалі харугвы янычараў. Структура абедзвюх харугваў была аднолькавая. Яны адрозніваліся толькі колькасна – у харугве Булавы Вялікай – 100 жаўнераў, Булавы Польнай – 80 [25, арк 77, 79]. На чале харугвы знаходзіўся ратмістр. Як і раней у гаротным стане знаходзілася артылерыя ВКЛ, якая ўключала ў сябе корпус артылелерыі і грэнадзѐрскую фрайкампанію. Корпус артылерыі налічваў усяго 49 чалавек і складаўся з штаба корпуса і адной роты. Камандны склад корпуса прадстаўлялі палкоўнік, обершэрлейтэнант (падпалкоўнік), маѐр, капітан, цугкапітан, паручнік, штыкюнкер, і оберфельдшар. Артылерыйская кампанія налічвала 30 кананіраў і 11 падафіцэраў. Асобная

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

грэнадзѐрская рота (фрайкампанія) шматлікасцю таксама не адзначалася, усяго разам яна налічвала 76 чалавек. Камандны састаў складаўся з капітана, паручніка, другога паручніка і ад'ютанта [25, арк. 45-46]. Нажаль, рэформы аказаліся палавінчатымі. Зрабіўшы крокі ў бок павелічэння колькасці войска і яго структурнай мадыфікацыі, прынцып камплектавання арміі заставаўся ранейшым – у кавалерыі шляхам прывода таварышамі сваіх почтаў, а ў пяхоце праз вярбоўку дабраахвотнікаў. Спроба Вайсковага дэпартаменту ўвесці вельмі абмежаваную колькасна рэкруцкую павіннасць (1000 рэкрутаў на год) аказалася няўдалай, таму што сустрэла моцную апазіцыю з боку шляхты. Ва ўмовах, калі вядучыя краіны Еўропы, такія як Францыя, Прусія, Расія ўжо перайшлі да рэкруцкага спосаба каммплектавання арміі, гэта быў відавочны недахоп, які значна зніжаў абараназдольнасць краіны. Грошай на забеспячэнне арміі катастрафічна не хапала і таму праблема ўтрымання жаўнераў часта ляжала на плячах камандзіраў падраздзяленняў. Так, брыгадзір велькапольскай брыгады нацыянальнай кавалерыі у 1776 г. з сумам ўзгадвае: ―Гэта вялікая бяда, што гола … дукатаў, якіх не слыхаць і не відаць. Каманду патрэбна апрануць, каб не было сорамна, каб плячамі не свяцілі  [31, s. 199]. Тым не менш, на сойме 1778 г. была пацверджана лінія на павелічэнне ―войска ў гемайнах і таварыства кавалерыі нацыянальнай , а праз двва гады на сойме зноў разглядалася пытанне аб даўкамплектаванні арміі ВКЛ [24, с.579; 32, с.585]. Нягледзячы на ўсе недахопы рэформа арміі ў 1775 г. з'яўлялася вельмі неабходнай для Рэчы Паспалітай з'явай. У выніку асцярожных дзеянняў Вайсковага дэпартаменту пачаліся станоўчыя зрухі ў пытанні арганізацыі ўзброеных сіл краіны. Армія Рэчы Паспалітай стала паступова пераўтварацца з дэкаратыўнага элемента ў сапраўдны баявы інструмент дзяржавы. Рэформа 1775 г. стала важным падмуркам для далейшага развіцця ўзброеных сіл як у ВКЛ, так і Польшчы, якое адбывалася ў канцы 80-х пачатку 90- хх гг. XVIII ст. Крыніцы і літаратура 1. Грыгор'еў, М. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі (1765-1794) / М. Грыгор'еў. - Мінск, 1994. – 168 с. 21 2. Гужалоўскі, А. Войска ВКЛ: апошнія старонкі гісторыі / А. Гужалоўскі // Бел. гіст. часопіс. – 1994. - № 1. – С. 48-52. 3. Чаропка, С.А. Войска ВКЛ у святле ваеннай рэформы 1717 г./ С.А. Чаропка// Науч. Труды Респ. инстит. высш. школы: сб. науч. статей; в 2 ч. Ч.1; редкол. В.Ф. Берков (отв. ред.) [и др.]. – Минск: РИВШ, 2012. - С.336-343 4. Чаропка, С. А. Ваенная рэформа ў Вялікім княстве Літоўскім 1764-1766 гг. / С.А. Чаропка // Беларусь і суседзі: шляхі фарміравання дзяржаўнасці, міжнацыянальныя і міждзяржаўныя адносіны: зборнік навук. Артыкулаў; вып. 1.; рэдкал.: Р.Р. Лазько [і інш.]. – Гомель: УА ―ГДУ імя Ф. Скарыны , 2012. – С. 25-30. 5. Gembarzewski, B. Rodowody pułków polskich i oddziłów równorzędnych od r.1717 do r. 1831 /B. Gembarzewski. – Warszawa nakładem tow.wiedzy wojskowej, 1925. – 100 s. 6. Górski, K. Historya piechoty polskiej / K.Górski. – Kraków nakładem księgarni polskiej spółki wzdawnicyej, 1893. – 274 s. 7. Górski, K. Historya jazdy polskiej / K. Górski. – Kraków nakładem księgarni polskiej spółki wzdawnicyej, 1894. – 366 s. 8. Górski, K. K. Historya artyleryi polskiej / K. Górski. – Warszawa, w księgarnie E.Wende, 1902. – 325 s. 9. Kukiel, M. Zarys historji wojskowości w Polsce /M. Kukiel. – Kraków, nakładem Krakowskiej spółki wzdawnicyej, 1929. – 356 s. 10. Nowak, T.M. Historia oręża Polskiego 963-1795 ó T.M. Nowak, J. Wimmer. – Warszawa: Wiedza powszechna, 1981. – 700 s. 11. Nowak, T. Dzieje oręża Polskiego do roku 1793 ó T. Nowak, J. Wimmer: w 3 t. T.1. – Warszawa: MON, 1968. – 418 s. 12. Rostafiński, N.Zarys historii rozwoju wojskowości w Polsce (992-1792) * N. Rostafiński.- Poznań: Nakł. księgarni Fr. Gutowskiego, 1922. – 164 s. 13. Wimmer, J. Historia piechoty polskiej do roku 1864 _ J. Wimmer. – Warszawa: MON, 1978. – 14. Augustyniak, U. Historia Polski. 1572-1795 ó U. Augustyniak. – Warszawa: wyd-wo naukowe PWN, 2008. – 1008 s. 15. Historia wojskowości polskiej. – Warszawa: MON, 1972. – 871 s. 16. Konstytucye Seymu pacificationis Warszawskigo 1717 r. // Volumina Legum. – Petersburg, nakładem i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VI. – S. 122-202. 17. Müller, R. Die Armee Augusts des Starken. Das sächsische Heer von1730 bis 1733/ R. Müller. – Berlin, Militärverlag der DDR, 1984. – 116 s. 18. Konfederacya Generalna omnium Ordinum Regni et Magni Ducatum Luthuaniae na konwokacyi Głowney Warszawskiey uchwalona // Volumina Legum. – Petersburg, nakładem i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VII. – S. 7-55. 19. Konstytucye Seymu walnego koronacyi krola IMCI 1764 r. // Volumina Legum. – Petersburg, nakładem i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VII. – S. 138-169. 20. Twardowski, B.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Wojsko polskie Kościuszki w roku 1794 / B. Twardowski. – Poznań, Nakł. Księgarni katolickiej, 1894. – 90 s. 21. Konstytucye Wielkiego Księstwa Litowskiego 1766 r. // Volumina Legum. – Petersburg, nakładem i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VII. – S. 222-244. 22. Konstytucye Seymu ordynarnego Warszawskiego roku 1776 od dnia 26 sierpnia aż do dnia 31 października, hod względem Konfederaczi Generalnej oboyga narodów agitującego się // Volumina Legum. – Petersburg, nakł. i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VIII. – S.526-564. 23. Konstytucye Wielkiego Xięstwa Litowskiego 1775 r. // Volumina Legum. – Petersburg, nakł. i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VIII. – S. 389-590. 24. Konstytucye Wielkiego Xięstwa Litowskiego 1776 r. // Volumina Legum. – Petersburg, nakł. i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VIII. – S.564-574. 22 25. Konstytucye Seymu ordynarnego Warszawskiego Sześcioniedzielnego roku Pańskiego 1778 dnia 5 miesiąca października // Volumina Legum. – Petersburg, nakł. i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VIII. – S.575-581. 26. Biblioteka Czartoryskich - Rękopis 2555 IV. - Komput y płaca woyska WXL. – 84 s. 27. Kitowicz, J. Opis obyczajów i zwyczajów za panowania Augusta III. – Kraków, 1925. 28. Kosmowski S. Pamętniki z końca XVIII wieku. – Poznań, 1867. 29. Konstytucye Seymu extraordynaryinegoWarszawskiego 1775 r. // Volumina Legum. – Petersburg, nakł. i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VIII. – S. 5-389. 30. Urywek wspomnień Józefa Rulikowskiego wydany z obszerniejszego rękopismu // Baranowski, B. Dzieje wojskowości Polskiejdo roku 1831 (wypisy źrodłowe) / B. Baranowski, W. Bortnowski, W. Lewandowski. – Warszawa: „Prasa wojskowa , 1949. – S.191-196. 31. Konstytucye Seymu walnego ordynarnego Grodzieńskiego Sześcioniedzielnego roku Pańskiego MDCCLXXXIV dnia 4 miesiąca października // Volumina Legum. – Kraków: nakł. Akademii Umejętności , 1889. – T. IX. – S.7-29. 32. Notaty generała brygady wielkopolskiej kawalerii narodowejz lat 1775-1778 // Baranowski, B. Dzieje wojskowości Polskiejdo roku 1831 (wypisy źrodłowe) / B. Baranowski, W. Bortnowski, W. Lewandowski. – Warszawa: „Prasa wojskowa , 1949. – S.196-199. 33. Konstytucye Seymu ordynarnego Warszawskiego Sześcioniedzielnego roku Pańskiego 1780 dnia 2 miesiąca października // Volumina Legum. – Petersburg, nakł. i drukiem J. Ohryzki, 1860. – T. VIII. – S.582-590.
Army of the Polish-Lithuanian commonwealth after reform of 1775. This article discusses the situation of the army of the Polish–Lithuanian Commonwealth in the middle of 18th century. Examines basic directions of military reform in the Polish-Lithuanian Commonwealth, 1775, which marked an important trying in the process of modernisation a regular army of the Kingdom of Poland and the Grand Duchy of Lithuania.
РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ